«Пахвальнае слова патрыярху Яўфімію» (1416—17). Творы напісаны вобразнай мовай, багатыя метафарамі, параўнаннямі, антытэзамі, рознымі складанымі фігурамі. Літ. спадчына Ц. Г. была добра вядома на ўсх.-слав. землях, у т. л. на Беларусі. Яго творы бытавалі ў шматлікіх рукапісных зборніках. З бібліятэк Супрасля, Жыровіч, Вільні захавалася больш за 200 зборнікаў з творамі Ц., шэраг з іх бел. паходжання. Яго пропаведзі, «словы», жыціі ўплывалі на развіццё бел. аратарскай прозы. Садзейнічаў умацаванню культ. сувязей усх. і паўд. славян, пашырэнню паўд.-слав. літ. уплываў на Русі.

*Тв.:* Похвално слово за Евтимий от Григорий Цамблак.— София, 1971; Житие на Стефан Дечански от Григорий Цамблак.— София, 1983.

*Літ.:* Яцимирский А. И. Григорий Цамблак.— СПб., 1904; Григорий Цамблак: Живот и творчество: Трети международен симпозиум.— София, 1984; Илиева Сивкова А. Григорий Цамблак.— У кн.: Труды отдела древнерусской литературы. М., 1985, т. 40, с. 65—69.

*В. А. Чамярыцкі.*

**ЦАМЯ́НКА,** будаўнічы, звычайна вапнавы, раствор з дамешкай драбнатоўчанай чырвонай цэглы для муроўкі і тынкоўкі сцен, іх грунтоўкі пад фрэскавы жывапіс.

Такі раствор выкарыстоўвалі фінікійцы (10 ст. да н. э.) для гідраізаляцыі вадасховішчаў і водаправодаў; яна пашырана ў буд-ве Ст. Грэцыі і Рыма, у манум. буд-ве Візантыі, адкуль у 10 ст. трапіла ў Ст. Русь.

На тэр. Беларусі Ц. ўжывалася з 11—12 ст. у муроўках: мяшанай (opus mixtum), са «схаваным радам», дэкаратыўнай мяшанай, раўнарадавай (Полацк, Тураў, Віцебск, Навагрудак, Гродна). У выніку чаргавання бледнаружовых палос Ц. і чырвонай *плінфы* паверхня сцяны мела дэкар. выгляд (Сафійскі сабор і Спаса-Ефрасіннеўская царква ў Полацку, храмы Барысаглебскага манастыра ў прадмесці Полацка Бельчыцы). Ц. ўжывалася часам у буд-ве канца 16 — пач. 17 ст. (палац у Старым замку ў Гродне).

*А. А. Трусаў, М. М. Цэйтліна.*

**«ЦАПЫ́»,** беларускі народны танец. Зафіксаваны ў 1940-я г. ў в. Альгова Віцебскага р-на. Выконваецца мужчынамі або мяшаным складам танцуючых, якія імітуюць рассціланне жыта і малацьбу яго цапамі. Муз. памер 2/4. Тэмп умераны. Сцэнічны варыянт створаны ў 1950-я г. балетмайстрам В. Партным у Віцебскім нар. ансамблі танца «Колас».

*Л. К. Алексютовіч.*

**«ЦАР І́РАД»,** народны тэатральны паказ. Вядомы ў *батлейцы, жывой батлейцы* і *народнай драме.*

**«ЦАР МАКСІМІЛЯ́Н»,** народная драма. Шырока бытавала на Беларусі, Украіне, Расіі. Паказы на Беларусі зафіксаваны з сярэдзіны 19 ст. (гл. ў арт. *Народная драма*), першыя запісы зроблены ў 2-й пал. 19 ст. Е. Раманавым, А. Грузінскім, М. Васільевым. Выконвалася на каляды, што і абумовіла яе асаблівасці, перш за ўсё вольнае, свайго роду карнавальнае светаадчуванне, нар.-святочную сістэму вобразаў. Створана на ўзор «Цара Ірада», аформлена ў адпаведнасці з традыцыямі і прыёмамі нар. творчасці. Складаецца з асн. сюжэта (лінія Максіміляна і яго непакорлівага сына Адольфа, які адмаўляецца «паверыць кумірыцкім багам» і адрачыся ад веры хрысціянскай) і інтэрмедыйнай часткі (2 серыі сцэн: пахаванні і паядынкі, т. зв. рыцарскія штурмаванні). Сцэны пахаванняў найб. пашыраныя і абавязковыя ў розных варыянтах «Ц. М.», у іх лепш за ўсё выявіліся традыцыі нар.-святочнай смехавай культуры, дзе смерць — не трагедыя, а падстава для жартаў, таму і пахаванні вясёлыя. Папулярная інтэрмед. сцэна лячэння старога «Дзед і доктар», аналагічная батлейкавай «Мацей і доктар». У запісах Васільева і М. Грынблата ёсць інтэрмедыя «Цыган і Максімілян мяняюцца коньмі». У «Ц.М.» розныя тыпы і формы паядынкаў; яны таксама вясёлыя, нават смяртэльныя, бо разыгрываліся і ўспрымаліся з асаблівым святочным, гарэзлівым настроем удзельнікаў і гледачоў. Умоўна да паядынкаў належыць і інтэрмед. сцэна «Аніка (Рыцар) і смерць» — варыянт сярэдневяковага казання «Спрэчка жыцця са смерцю». На большасці варыянтаў «Ц. М.» адбіўся ўплыў нар. драмы «Лодка». Часам «Ц. М.» выконваўся і ў батлейцы.

*Літ.:* Стэльмах Д. У. Народная драма «Цар Максімілян» і яе бытаванне на Беларусі.— У кн.: Беларуская літаратура. Мн., 1980, в. 8; яе ж. Узнікненне і развіццё народнай драмы на Беларусі.— Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук, 1982, № 6.

*Дз. У. Стэльмах.*

**ЦАР ПРО́ЖАР,** сатырычны персанаж беларускіх чарадзейных казак (сюжэтнага тыпу АТ 650 І), у якім увасоблены рысы жорсткага, самаўладнага цара-дэспата. Вобраз Ц. П. намаляваны з дапамогай гіпербалы і гратэску: ён з'ядае штодзень па 10 чалавек, якіх яму дастаўляе служка нягідны Сокал, а вочы яго так заплылі тлушчам, што слугі вымушаны падымаць павекі вілкамі (у казках народ даваў цару зняважальныя мянушкі: Гарох, Лукапёр, Чубара, Трасцыт і інш.). З Ц. П. распраўляецца асілак Іллюшка — забівае яго сваёй 12-пудовай шапкай. Вобраз Ц. П. блізкі да былiннага персанажа Ідалішча Паганага.

*А. С. Фядосік.*

**ЦАРАНКО́ВА** (дзявочае Сцяфанава) Людміла Пятроўна (н. 7.11.1930, г. Варонеж), беларуская сав. спявачка (лірыка-каларатурнае сапрана). Засл. артыстка БССР (1968). Скончыла Магілёўскае муз. вучылішча (1953). З 1953 салістка Дзярж. акадэмічнай хар. капэлы БССР. Валодае прыгожым голасам чыстага тэмбру. Выканаўца нар. песень («Люблю наш край» на сл. К. Буйло, «О, не кукуй, зязюленька» і інш.), сольных партый у харавых і кантатна-аратарыяльных творах бел., рус. і зах.-еўрап. кампазітараў («Дняпро» Я. Туранкова, «Павей, ветрык» Р. Пукста, «Мелодыя» С. Рахманінава, «Аве Марыя» А. Луццы ў апр. Э. Тырманд) і інш. Удзельніца Дэкады літаратуры і мастацтва ў Маскве (1955). У складзе капэлы гастраліруе па краіне, выязджала ў ПНР (1958).

**ЦАРКВА́-КРЭ́ПАСЦЬ,** храм 15—16 ст. На Беларусі вядомы ў 15—17 ст. (гл. ў арт. *Храм-крэпасць*).

**ЦАРКО́ЎНА-ПАЛЕМІ́ЧНАЯ ЛІТАРАТУ́РА,** гл. ў арт. *Палемічная літаратура.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ